

Алена КАХНОЎСКАЯ,
*старшы выкладчык кафедры педагогікі і псіхалогіі дашкольнай і пачатковай адукацыі, Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі*

# ПАДЫХОДЫ ДА АРГАНІЗАЦЫІ ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ВА ЎМОВАХ УСТАНОВЫ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

*У артыкуле аналізуюцца тэарэтычныя падыходы да арганізацыі этнакультурнага выхавання дзіцяці ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі. Кожны з іх грунтуецца на пэўным складніку этнічнай культуры: мова, каштоўнасці, традыцыі і інш. Так, аксіялагічны падыход арыентуе этнавыхаванне на каштоўнасны змест; лінгвістычны падыход разглядае этнічную мову як асноўны сродак сацыялізацыі асобы ў этнакультурным асяродку; дзейнасны падыход у выхаванні першасную ролю надае дзейнасці асобы і г.д. Абмяркоўваецца неабходнасць комплекснага выкарыстання асноўных складнікаў этнічнай культуры як цэласнай сістэмы з мэтай арганізацыі эфектыўнага далучэння дзяцей дашкольнага ўзросту да этнакультурнай спадчыны.*

*The article examines theoretical approaches to children ethnocultural education in preschool institutions. Each of them is based on a specific aspect of ethnic culture: language, values, traditions etc. Accordingly to axiological approach ethic education approach is value focused. Linguistic approach considers ethnic language as a principal way of person's socialization in ethno-cultural environment. Activity approach in education gives key role to human activities. It is discussed to use basic components of ethnic culture as an integrated system in order to introduce preschool age children to ethno-cultural heritage.*

***Ключавыя словы:*** *этнічная культура, этнакультурнае выхаванне, падыходы да этнакультурнага выхавання, этнакультурнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту.*

***Key words:*** *ethnic culture, ethno-cultural education, approaches to ethno-cultural education, ethno-cultural education of preschool children.*

Сёння вялікая ўвага надаецца праблеме этнакультурнага выхавання. Адным з сур'ёзных наступстваў глабалізацыі з'яўляецца знікненне этнасаў, іх моўных, культурных традыцый. Ідэя ж этнакультурнага выхавання заключаецца ў імкненні захаваць этнічную ўнікальнасць, культуру. Розныя аспекты праблемы прадстаўлены ў работах беларускіх і расійскіх даследчыкаў:

Г.П. Арловай, Г.А. Барташэвіч, В.С. Болбаса, Л.М. Варанецкай, Г.Н. Волкава, А.А. Грымаця, Д.М. Дубінінай, Д.У. Дубініна, З.П. Васільцовай, У.М. Конана, І.І. Крука, В.С. Кукушына, А.Ю. Лозкі, П.І. Підкасістага, Л.В. Ракавай, В.А. Салеева, Н.Я. Шчурковай і інш. Вышэйзгаданыя аўтары трактуюць паняцце «этнакультурнае выхаванне» ў якасці ўмацавання пераемнасці пакаленняў, умовы фарміравання дасканалага чалавека (народнага ідэалу); працэсу ўключэння асобы ў этнакультуратворчую дзейнасць; працэсу засваення каштоўнаснага ідэалу роднай культуры; выхавання ў этнічным культурным асяродку.

Параўнальны аналіз псіхолага-педагагічнай і метадычнай літаратуры паказаў, што найбольш распаўсюджанымі метадамі этнакультурнага выхавання з'яўляюцца: перакананне, прыклад, тлумачэнне, прывучэнне і практыкаванне, блаславўленне і інш. У шэрагу даследаванняў аўтары атаясамліваюць метады і сродкі выхавання, якія цесна ўзаемазвязаны паміж сабой і прымяняюцца ў адзінстве. Сярод сродкаў вылучаюць родную мову, прыроду, працу, гульню, традыцыі і звычаі, вусную народную творчасць, народныя рамёствы. Асаблівае месца ў працэсе этнакультурнага выхавання надаецца бацькам, блізкім членам сям'і. На думку вучоных, арганізацыя этнавыхавання павінна здзяйсняцца праз працоўныя і святочныя аб'яднанні дзяцей, засваенне, «прысваенне» ўзораў дзейнасці і паводзін, сацыяльных норм. «Моц уздзеяння зместу, сродкаў, форм і метадаў народнай педагогікі можна растлумачыць блізкасцю яе да нацыянальных каранёў, больш глыбокім пранікненнем у нацыянальную самасвядомасць», — падкрэсліваў А.А. Грымаць [2, с. 8].

Справядліва адзначыць адаптыўнасць дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту да этнічных форм культуры. У дзяцей дашкольнага ўзросту актыўна развіваюцца: вобразнае мысленне, эмацыянальнае ўспрыманне і суперажыванне, цікавасць да навакольнага асяроддзя, творчае ўяўленне, што стварае спрыяльныя ўмовы для фарміравання першапачатковых ведаў пра гісторыю і культуру свайго народа. Напрыканцы дашкольнага ўзросту ў дзіцяці адбываецца інтэнсіўнае засваенне этнічных норм паводзін, фарміраванне маральных арыентацый.

Існуе шэраг тэарэтычных падыходаў да этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту. Яны вызначаюць пэўны вобраз выхавання, які ўжо склаўся і рэалізуецца ў практычнай дзейнасці, або той, які яшчэ толькі фарміруецца. Кожны з падыходаў мае свой катэгарыяльны апарат.

Адным з асноватворчых падыходаў да этнакультурнага выхавання дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту мы лічым *лінгвістычны падыход*. Значную ролю роднаму слову надавалі Я.А. Каменскі, В.А. Сухамлінскі, К.Д. Ушынскі і інш. Сярод першых уклад у выхаванне і навучанне дзяцей на роднай беларускай мове ўнеслі Цётка, Я. Колас і інш. Таленавітая беларуская паэтэса, асветніца і педагог Цётка вялікую ўвагу надавала адраджэнню і развіццю нацыянальнай мовы, заклікала настаўнікаў пачатковых класаў народных школ ажыццяўляць навучанне дзяцей на роднай мове.

Праблемам сучаснага развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму прысвечаны работы беларускіх даследчыкаў Д.М. Дубінінай, Т.В. Паліевай, Н.С. Старжынскай. Паводле Н.С. Старжынскай, менавіта мова з'яўляецца базісным элементам культуры, «авалоданне ж разам з рускай багаццямі беларускай мовы складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы дзіцяці, засваення ім нацыянальнай культуры, станаўлення нацыянальнай самасвядомасці» [11, с. 381—382]. Пытанні развіцця выразнага маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту сродкамі беларускага фальклору разглядаюцца ў працах Д.М. Дубінінай. Аўтар характарызуе вусную народную творчасць як «найбольш зручны сродак, які дазваляе ўвесці дзіця ў атмасферу жывога слова» [4, с. 4].

Лінгвістычны падыход да этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных у далучэнні да этнічнай спадчыны, выступае выдатным сродкам яго ідэнтыфікацыі ў этнакультурным асяроддзі.

Значная роля надаецца *культуралагічнаму падыходу* да этнакультурнага выхавання дзяцей. Сучасныя прадстаўнікі

культуралагічнага падыходу разглядаюць культуру ў выхаванні з розных пазіцый. Культура набывае ролю мэты выхаваўчага працэсу (Д.М. Дубініна, А.Ю. Лозка і інш.), разглядаецца ў якасці сродку фарміравання выхаваўчага асяроддзя (Т.В. Паштарова, Н.А. Платохіна, Р.М. Чумічова і інш.), умовы самаразвіцця, самарэалізацыі асобы (Я.В. Бандарэўская, М.І. Запрудскі і інш.). На аснове культуралагічнага падыходу ствараюцца адукацыйныя тэхналогіі і комплексы (Н.А. Бондарава, Г.І. Губа, Д.М. Дубініна і інш.). Культуралагічны падыход арыентуе на стварэнне ў адукацыйнай прасторы такіх умоў, у якіх кожнае дзіця зможа самавызначыцца, самарэалізавацца (М.І. Запрудскі).

*Дзейнасны падыход* у этнакультурным выхаванні надае ключавое значэнне тым відам дзейнасці, якія садзейнічаюць развіццю асобы. Этнакультурнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту разглядаецца многімі навукоўцамі як мэтаскіраваны працэс перадачы дзецям пэўных уяўленняў пра сваю этнічную культуру на аснове іх ўключэння ў культуратворчую дзейнасць.

На думку Н.Я. Шчурковай, адносіны як асноўны змест выхавання павінны будавацца такім чынам, каб педагогі дапамаглі дзіцяці авалодаць культурным багаццем праз адметную арганізацыю іх жыццядзейнасці. «Гэтую жыццядзейнасць, — падкрэслівае аўтар, — мэтазгодна ажыццяўляць у трох кірунках:

- асваенне культуры (азнаямленне са светам і жыццём на ўзроўні культуры);
- засваенне культуры (узаемадзеянне са светам на ўзроўні культуры);
- прысваенне культуры (пражыванне адносін да свету і жыцця на ўзроўні культуры).

Вынікам арганізаванай такім чынам жыццядзейнасці з'яўляюцца веды пра свет, уменне ўзаемадзейнічаць са светам, адносіны да свету» [13, с. 24].

Зазначым, што даследчык актуалізуе дадзены падыход, грунтуючыся на абстрактным разуменні культуры, аднак дэталёва зместавыя кампаненты аўтар не раскрывае.

У рамках дзейнаснага падыходу этнакультурнае выхаванне дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту даследчыкі ажыццяўляюць праз зварот да розных відаў дзіцячай дзейнасці. Так, Л.Я. Ніканава выхаванне першасных уяўленняў пра патрыятызм у дзяцей дашкольнага ўзросту прапануе ажыццяўляць на аснове арганізацыі пазнавальнай практычнай дзейнасці: «...мэтанакіраваны працэс педагагічнага ўздзеяння на асобу дзіцяці дзеля ўзбагачэння яе сістэмай даступных для дадзенага ўзросту ведаў аб родным краі, краіне, фарміравання эмацыянальна-станоўчых адносін і цікавасці да дадзенай інфармацыі, развіцця патрэбы ў агульнакарыснай дзейнасці, якая рэалізуецца ў вопыце дзейнасных адносін да навакольнай рэчаіснасці» [8, с. 11]. Вучоны мяркуе, што веды і пачуцці, якія маюць асноватворную ролю для дзейнасці дзяцей, самі фарміруюцца і ўдасканальваюцца ў гэтай дзейнасці.

Г.П. Арлова, Т.Д. Вакушэнка, С.П. Марзан прапануюць выкарыстоўваць у выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту як сумесную з дарослым, так і самастойную дзейнасць [1]. Даследчыкі ўпэўнены ў тым, што дзейнасць дае дзіцяці магчымасць засвойваць веды, выказваць свае адносіны да засвоенага, набываць практычныя навыкі ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем. У той жа час дзейнасць, перш за ўсё сумесная, з'яўляецца своеасаблівай школай перадачы сацыяльнага вопыту. У дзейнасці дзіця становіцца суб'ектам гэтага працэсу, здольным актыўна ўдзельнічаць у пераўтварэнні наваколля, праяўляць сябе ў канкрэтнай змястоўнай дзейнасці менавіта як актыўны, самастойны «пераўтваральнік» (А.Ю. Лозка).

Праблемам вывучэння тэарэтычных асноў этнакультурнага выхавання дзяцей у тэатральнай дзейнасці прысвечана даследаванне Г.І. Губы. Этнавыхаванне разглядаецца даследчыкам як «дзейнасць, накіраваная на павышэнне этнічнай дасведчанасці, фарміраванне асноў нацыянальнай самасвядомасці і станоўчай этнічнай ідэнтычнасці праз засваенне каштоўнасных арыентацый свайго народа, якая забяспечвае ўваходжанне дзіцяці ў кантэкст сусветнай культуры» [3, с. 13].

Згаданыя вышэй работы сведчаць не толькі пра актуальнасць дзейнаснага падыходу да этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту, але і пра differentнабаковасць асэнсавання працэсу яго арганізацыі.

*Аксіялагічны падыход* да выхавання базіруецца на каштоўнасцях жыцця і культуры. У сваю чаргу, каштоўнасны вынік этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту ацэньваецца сучаснымі даследчыкамі з розных пазіцый:

- галоўная роля ў засваенні каштоўнасцей надаецца іх усведамленню праз «пазнавальныя» формы (тлумачэнне, гутаркі, дыскусіі). Праблемы фарміравання этнакультурнай дасведчанасці дзяцей дашкольнага ўзросту апісаны Т.В. Паштаровай. Вызначальнымі метадамі актывізацыі працэсу фарміравання этнакультурнай дасведчанасці дзяцей даследчык лічыць метады, накіраваныя на павышэнне іх пазнавальнай і эмацыянальнай актыўнасці [9, с. 28—36];
- ступень асваення каштоўнасцей праяўляецца толькі на ўзроўні матываў сацыяльных паводзін. Змест выхавання заключаецца ў актыўнай арганізацыі асабістай дзейнасці выхаванцаў, стварэнні сітуацый выбару, абуджэнні іх ініцыятывы і адказнасці;
- вынік выхавання на аксіялагічным узроўні звязаны з каштоўнаснымі адносінамі выхаванцаў. Каштоўнасныя адносіны маюць трохкампанентную структуру: кагнітыўны кампанент — паняцці і ўяўленні пра жыццё; эмацыянальна-ацэначны — перажыванне нейкай падзеі, з'явы, яе ацэнка; паводзінны кампанент — вопыт дзеянняў, уменняў, навыкаў, гатоўнасць у паводзінах да канкрэтных сацыяльных дзеянняў. Фарміраванню маральнай устойлівасці садзейнічае развітая каштоўнасная свядомасць асобы.

Паводле Д.М. Дубінінай, структура этнавыхавання ўтрымлівае наступныя кампаненты: каштоўнасна-арыентацыйны (выбар каштоўнасных арыенціраў, якія вызначаюць адносіны дзіцяці да навакольнага асяроддзя), рэфлексіўны (асэнсаванне дзецьмі свайго вопыту адносін і пабудова ўласнай індывідуальнай карціны свету) і дзейнасны (пражыванне дзіцём уласнай індывідуальнай карціны свету ў актыўным пераўтварэнні навакольнай рэчаіснасці). Галоўнымі прынцыпамі этнакультурнага выхавання з'яўляюцца наступныя: культураадпаведнасці, гуманістычнай арыентацыі выхавання, выхоўваючага культурнага асяроддзя, суб'ектнасці ў выхаванні. Змест выхавання ўключае тры напрамкі: народазнаўства, краязнаўства, народнае мастацтва. Веды разглядаюцца ў якасці абавязковага кампанента працэсу фарміравання асноў этналагічнай культуры, а адносіны — у якасці выніковага прадукту [5].

Айчынныя даследчыкі І.І. Калачова, Л.В. Ракава, В.У. Чэчат разглядаюць *сям'ю* як каштоўнасны складнік этнакультурнага выхавання дзіцяці, а традыцыі народнай сямейнай педагогікі беларусаў — як неад'емную частку педагогікі ў цэлым. «Менавіта вясковая сям'я адыгрывала першаступенную ролю ў выхаванні дзяцей, іх сацыялізацыі, падрыхтоўцы да самастойнага жыцця. Акрамя таго, яна была і асяродкам, і школай этнапедагогікі. Праз сям'ю, сістэму роднасці перадаваліся педагагічныя веды і вопыт з пакалення ў пакаленне, забяспечваючы трансмісію педагагічных традыцый народа» [10, с. 115]. І.І. Калачова ў сваіх работах таксама падкрэслівае ролю сям'і і бліжэйшага акружэння ў развіцці маральна-патрыятычных пачуццяў дзіцяці, якія павінны фарміравацца на аснове далучэння да народнай педагагічнай ідэі як важнага інстытута перадачы народных ведаў [6].

Значнай увагі заслугоўваюць даследаванні, прысвечаныя пытанням выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту *ў шматнацыянальным асяроддзі,* фарміраванню асноў нацыянальнай і этнічнай талерантнасці (Л.В. Каламійчанка, Р.М. Чумічова, Н.А. Платохіна і інш.). Р.М. Чумічова і Н.А. Платохіна разглядаюць працэс выхавання ва ўстанове дашкольнай адукацыі як «сацыякультурнае суб'ект-суб'ектнае асяроддзе, якое абумоўлівае выхаванне ў дзяцей талерантнасці адзін да аднаго» [12, с. 72]. На думку навукоўцаў, неаднароднае культурнае асяроддзе (шматнацыянальнае) дапаможа дзіцяці вылучыць сваё нацыянальнае «Я» і ідэнтыфікавацца ў этнічнай супольнасці, што забяспечыць умацаванне асноў нацыянальнай самасвядомасці ў сістэме міжасобасных адносін у шматнацыянальнай групе. Асновай фарміравання этнічнай талерантнасці з'яўляецца далучэнне дзяцей да этнакультуры, якая закладвае падмурак міжасобасных стасункаў, а спасціжэнне дзецьмі культуры іншых нацыянальнасцей вучыць заўважаць агульнае

і рознае, паважліва ставіцца да культурных каштоўнасцей, праяўляць талерантныя адносіны да людзей іншых этнасаў (Л.В. Каламійчанка).

Тэарэтычны аналіз работ паказвае, што праблема этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту прадстаўлена ў сучаснай навуцы як складаны феномен, які інтэгруе мноства самастойных аспектаў. Большасць зафіксаваных падыходаў канстатуецца, аднак іх змест, тэхналогіі і методыкі рэалізацыі раскрываюцца не заўсёды. Сама этнічная культура ў вышэйзгаданых падыходах фіксуецца паэлементна, прагледжваецца аднабаковасць, недастатковасць яе разумення (як культуратворчай дзейнасці, каштоўнасцей, традыцыі і інш.). У выніку комплексны падыход да выкарыстання этнічнай культуры беларусаў у выхаваўчым працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі адсутнічае.

Разам з тым, аналіз апісаных падыходаў дазволіў нам вызначыць аўтарскую пазіцыю ў дачыненні да рэалізацыі этнакультурнага выхавання дзяцей ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі. Эфектыўнасць этнакультурнага выхавання дасягаецца праз мэтаскіраванае і паслядоўнае стварэнне ўмоў для асваення, засваення і прысваення дзецьмі дашкольнага ўзросту этнічнай культуры беларусаў як цэласнай сістэмы. Неабходна ўлічваць ролю асяроддзя ў развіцці дзіцяці: «Дзейнасна апасродкаванае кіраванне развіццём дзіцяці неэфектыўнае, калі асяроддзе ўскладняе дзейнасць. Выхаваўчая сістэма дае збоі або нават рушыцца, калі ўваходзіць у супярэчнасць з асяроддзем» [7, с. 36]. Таму ў якасці адной з умоў этнакультурнага выхавання дзяцей неабходна разглядаць спецыяльна створанае *этнакультурна ўзбагачанае развіццёвае асяроддзе дашкольнай установы*. Этнакультурна ўзбагачанае развіццёвае асяроддзе з'явіцца ўмовай, якая дапаможа пераадолець аднабаковасць у этнакультурным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту, пабудаваць эфектыўную сістэму.

Паступіла ў рэдакцыю 30.11.2015 г.

ЛІТАРАТУРА:

1. *Арлова, Г.П.* Праграма па этнавыхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту: вучэбна-метадычны дапам. / Г.П. Арлова, Т.Д. Вакушэнка, С.П. Марзан. — Віцебск: Віцеб. дзярж. ун-т, 2004. — 193 с.

2. *Грымаць, А.А.* Беларуская народная педагогіка: тэорыя і практыка / А.А. Грымаць, Л.М. Варанецкая. — Мінск: ДПУ, 1996. — 191 с.

3. *Губа, Г.И.* Этнокультурное воспитание дошкольников и младших школьников в театральной деятельности: Автореф. дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01 / Г.И. Губа; Кур. гос. ун-т. — Курск, 2007. — 24 с.

4. *Дубініна, Д.М.* Беларускі фальклор як сродак развіцця выразнага маўлення старэйшых дашкольнікаў ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму: дыс. ... канд. пед. навук: 13.00.07 / Д.М. Дубініна. — Мінск, 1997. — 151 л.

5. *Дубініна, Д.М.* Культура Беларусі ў казках і паданнях: этнакультурная адукацыя дашкольнікаў: дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі / Д.М. Дубініна, Д.У. Дубінін. — Мінск: Зорны верасень, 2008. — 120 с.

6. *Калачова, І.І.* Ад добрага кораня — добры парастак: этнапедагагічныя традыцыі беларусаў у выхаванні дзяцей: дапам. для педагогаў дашкольных устаноў / І.І. Калачова. — Мінск: НМЦэнтр, 1999. — 126 с.

7. *Майнулов, Ю.С.* Средовой подход в воспитании / Ю.С. Майнулов // Педагогика. — 2000. — № 7. — С. 36—41.

8. *Никонова, Л.Е.* Воспитание начал патриотизма у детей старшего дошкольного возраста: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.07 / Л.Е. Никонова. — Минск, 1987. — 189 л.

9. *Поштарёва, Т.В.* Формы и методы формирования этнокультурной осведомлённости детей / Т.В. Поштарёва // Дошкольное воспитание. — 2007. — № 12. — С. 28—36.

10. *Ракава, Л.В.* Традыцыйная мадэль дзяцінства: этнапедагогіка / Л.В. Ракава // Адукацыя і выхаванне. — 1996. — № 5. — С. 20—26.

11. *Старжынская, Н.С.* Методыка развіцця роднай мовы: вучэбны дапам. / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. — Мінск: Выш. шк., 2008. — 301 с.

12. *Чумичёва, Р.М.* Воспитательное пространство современного дошкольника / Р.М. Чумичёва // Муниципальное воспитательное пространство в парадигме личностно-ориентированного образования: материалы всерос. науч.-практ. конф., Таганрог, 28—29 ноября, 2008 г. / Таганрог. гос. пед. ин-т; под ред. Г.Ф. Гребенщикова. — Таганрог, 2008. — С. 93—102.

13. *Щуркова, Н.Е.* Новое воспитание / Н.Е. Щуркова. — М.: Педагогическое о-во России, 2000. — 118 с.